**М.Л. Кузьмініч**

## *Удасканаленне падрыхтоўкі арганізатараў народна-інструментальнай творчасці як цэласны працэс*

Апошняе дзесяцігоддзе XX ст. вызначасцца рэфармаваннем усёй сістэмы адукацыі, у тым ліку і вышэйшай. Мінскі інстытут культуры ў 1995 г. быў пераўтвораны ў вышэйшую ўстанову універсітэцкага тыпу, у якой рэалізуецца шматузроўневая сістэма падрыхтоўкі кадраў. У сувязі з гэтым наспела неабходнасць з пазіцый цэласнага падыходу прааналізаваць вучэбна-выхаваўчы працэс у адзінстве і ўзаемасувязі ўсіх складаючых яго частак, суаднесці тэхналогію навучання і выхавання з комплексам фарміруемых у ВНУ адносін, з культурна-асобасным строем будучых спецыялістаў. Пры гэтым мы зыходзілі з неабходнасці выраашэння дыялектычных супярэчнасцей, якія парушаюць цэласнасць вучэбна-выхаваўчага працэсу і выражаюцца ў неадпаведнасці дзелавых і асобасных якасцей выпускнікоў патрабаванням практыкі, сацыяльнаму заказу грамадства. Сярод такіх супярэчнасцей — наяўнасць разрыву паміж прафесійнай дзейнасцю спецыяліста і формай засваення гэтай дзейнасці ў ВНУ; адсутнасць гарманічнай узгодненасці паміж падсістэмамі цэласнага выхаваўчага працэсу як вынік неравышэння ролі асобных элементаў вучэбна-выхаваўчай сістэмы; недастаткова высокага ўзроўню педагагічнага майстэрства выхавацеляў; супярэчнасць паміж неабходнасцю засваення студэнтамі тэхналогіі будучай прафесійнай дзейнасці і адсутнасцю ў ВНУ адпаведных арганізацыйна-педагагічных умоў для гэтага.

Гіпотэзай нашага даследавання стала меркаванне аб тым, што павышэнне якасці падрыхтоўкі арганізатараў народна-інструментальнай творчасці ва універсітэце культуры можа быць забяспечана пры ўмове цэласнага падыходу да ўдасканалення тэхналагічных асноў арганізацыі вучэбна-выхаваўчага працэсу. Гэта азначае: а) павышэнне цэласнасці асобных элементаў тэхналагічнай падсістэмы і ўмацаванне сувязей паміж імі; б) суаднясенне пераўтварэнняў у галіне тэхналогіі вучэбна-выхаваўчага працэсу з магчымымі зменамі ў сацыяльна-псіхалагічнай і культурна-асобаснай падсістэмах цэласнага працэсу; в) мадэліраванне ў

тэхналогіі навучальнага працэсу цэласнай карціны прафесійнай дзейнасці музыканта-народніка.

Спецыфіка выхаваўчай сістэмы ВНУ вызначаецца перш за ўсё яе прызначэннем. Мэтай і вынікам працэсу фарміравання асобы спецыяліста ва універсітэце з'яўляецца культурна-асобасны, прафесійны строй чалавека. Паняцце цэласнасці адносна фарміравання асобы арганізатара народна-інструментальнай творчасці мы разглядалі як унутранае адзінства агульнай і прафесійнай падрыхтоўкі спецыялістаў пры яе адносных самастойнасці і незалежнасці ад знешняга асяроддзя, як адзінства ўсіх напрамкаў выхавання, усёй разнастайнасці формаў, сродкаў і ўмоў.

Хаця выдзяленне агульнага і прафесійнага ў развіцці асобы мае адносны характар, іх узаемасувязь і ўзаемадзеянне непасрэдна сведчаць аб узроўні цэласнасці вучэбна-выхаваўчага працэсу. Тут важна тое, што агульнае ў развіцці асобы выступае як цэлае, часткай якога з'яўляецца прафесійнае. Такім чынам, у аснове вывучэння ўзаемаадносін гэтых бакоў падрыхтоўкі спецыялістаў ляжыць дыялектычнае адзінства часткі і цэлага. Агульнае ў развіцці асобы характарызуецца ўсебаковасцю і гарманічнасцю развіцця яе псіхалагічнай структуры, узроўнем яе цэласнасці. Яно праяўляецца ў агульнай культуры асобы і сведчыць аб ступені развіцця і рэалізацыі сутнасных сіл чалавека, яго здольнасцей і таленту.

Прафесійнае станаўленне асобы з'яўляецца адным з этапаў яе развіцця і характарызуецца імкненнем і падрыхтаванасцю да працы ў сферы культуры і мастацтва, прафесійнымі ведамі, уменнямі, навыкамі, прафесійнай культурай і этыкай. Такім чынам, прафесійнае развіццё асобы базіруецца на яе агульным развіцці і ўяўляе сабой дастасаванне духоўных, фізічных і інтэлектуальных сіл асобы да рашэння прафесійных праблем. Агульнае і прафесійнае ў развіцці асобы ўзаемадапаўняюць і ўзбагачаюць адно аднаго. Іх гарманічнае спалучэнне з'яўляецца ўмовай фарміравання цэласнай асобы і магчыма толькі пры арганізацыі цэласнага педагагічнага працэсу.

У ходзе даследавання сучаснага стану і механізмаў функцыяніравання тэхналагічнай падсістэмы цэласнага вучэбна-выхаваўчага працэсу падрыхтоўкі арганізатараў народна-інструментальнай творчасці ва універсітэце культуры мы прыйшлі да высновы, што тэхналагічныя асновы арганізацыі падрыхтоўкі спецыялістаў недастаткова адпрацаваны

як на ўзроўні тэорыі, так і на ўзроўні рэальнай практыкі, а цэласнасць тэхналогіі і суаднясенне яе элементаў з сацыяльна-псіхалагічнай і культурна-асобаснай падсістэмамі на сённяшні час забяспечваецца ў недастатковай ступені.

На канстатуючым этапе даследавання было ўстаноўлена, што вялікая колькасць студэнтаў спецыялізацыі не задаволена зместам і арганізацыяй навучання ва універсітэце. Сярод прычын такога стану спраў вылучаюцца: а) адсутнасць у некаторых студэнтаў накіраванасці на работу ў адпаведных установах культуры; б) недаацэнка значнасці асобных дысцыплін вучэбнага плана для агульнага і спецыяльнага развіцця спецыяліста; в) адмоўныя адносіны з боку студэнтаў да некаторых вывучаемых прадметаў; г) недастаткова высокі, на думку студэнтаў, узровень выкладання гэтых прадметаў.

Каб вызначыць прычыны нізкага ўзроўню выкладання, былі прааналізаваны адказы студэнтаў на пытанні анкеты. Пры гэтым мы зыходзілі з меркавання аб тым, што дзейнасць выкладчыкаў (як, дарэчы, і дзейнасць студэнтаў) залежыць ад шэрагу аб'ектыўных і суб'ектыўных арганізацыйна-педагагічных умоў, якія ўплываюць на вучэбна-выхаваўчы працэс. Сярод аб'ектыўных умоў — матэрыяльна-тэхнічная база універсітэта, прававое забеспячэнне навучальнага працэсу, прасторава-часавыя ўмовы, а таксама заканамернасці вучэбна-выхаваўчага працэсу і патрабаванні з боку грамадства, якія прад'яўляюцца да вышэйшых навучальных устаноў увогуле. Аб'ектыўныя ўмовы выступаюць як нешта данае, якое не падлягае ў дадзены момант карэкцыі з боку выкладчыка і студэнта.

Сярод суб'ектыўных арганізацыйна-педагагічных умоў можна вылучыць выбар выкладчыкамі найбольш эфектыўных сродкаў, формаў і метадаў навучання, стымулявання і кантролю; прафілізацыю зместу прадметаў; узмацненне міжпрадметных сувязей у мэтах выключэння дубліравання; арганізацыю эфектыўнай самастойнай работы студэнтаў і інш. Суб'ектыўныя арганізацыйна-педагагічныя ўмовы цесна звязаны з дзейнасцю выкладчыка. Культура і прафесійнае майстэрства арганізатараў выхаваўчага працэсу непасрэдна праяўляюцца ў тым, як элементы тэхналогіі ўзаемадзейнічаюць паміж сабой, у якой ступені яны накіраваны на дасягненне мэт вучэбна-выхаваўчага працэсу.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Пісьмовае апытанне студэнтаў спецыялізацыі засведчыла наяўнасць у тэхналогіі вучэбна-выхаваўчага працэсу шэрага недахопаў, якія адмоўна адбіваюцца на задаволенасці студэнтаў зместам і арганізацыяй навучання ва універсітэце. Незадаволенасць абумоўлена, у прыватнасці, арыентацыяй часткі студэнтаў на работу, не звязаную з аматарскай народна-інструментальнай творчасцю. Заўвагі студэнтаў выклікае змест вучэбнага плана: пералік вывучаемых дысцыплін, суадносіны паміж рознымі цыкламі прадметаў, паміж аўдыторнымі і самастойнымі заняткамі і г.д. У той жа час студэнты недаацэньваюць значнасць асобных дысцыплін для свайго агульнага і прафесійнага развіцця, і адпаведна іх адносіны да такіх прадметаў характарызуюцца нізкім балам.

Вынікі апытання сведчаць і пра іншыя ўласцівыя тэхналогіі недахопы. Так, узровень выкладання толькі ў выключных выпадках ацэньваўся студэнтамі вышэй за чатыры балы. Сярод прычын аб'ектыўнага парадку (акрамя заўваг у адрас навучальнага плана) указвалася на слабую матэрыяльна-тэхнічную базу універсітэта. Недастаткова выкарыстоўваюцца ў навучальным працэсе сучасныя сродкі, формы і метады навучання, змест прадметаў часам слаба звязваецца з будучай прафесійнай дзейнасцю спецыяліста. Выказваліся прэтэнзіі і да прафесійнага ўзроўню выкладчыкаў, да якасці праводзімых імі заняткаў.

Аналіз атрыманых у ходзе апытання адказаў і прапаноў па ўдасканаленні вучэбна-выхаваўчага працэсу ва універсітэце дазволіў нам намеціць асноўныя напрамкі гэтай работы. Гэта: умацаванне матэрыяльна-тэхнічнай базы навучальнага працэсу, удасканаленне вучэбных планаў і раскладаў заняткаў, пераразмеркаванне вучэбнага часу ў бок павелічэння самастойнай работы студэнтаў, стварэнне неабходных умоў для прадуктыўнай самастойнай работы, умацаванне сувязей навучальнага працэсу з прафесійнай дзейнасцю арганізатараў народна-інструментальнай творчасці. У аснову комплекснай праграмы мерапрыемстваў кафедры па ўдасканаленні навучальнага працэсу былі пакладзены:

1. Прынцып комплекснасці, г.зн. ахоп усіх бакоў дзейнасці кафедры па ўдасканаленні вучэбна-выхаваўчага працэсу – прафарыентацыйнай, арганізацыйнай, вучэбна-творчай, навукова-даследчай, метадычнай і г.д.

2. Прынцып цэласнасці, г.зн. накіраванасці ўсіх мерапрыемстваў, усіх змяненняў тых ці іншых элементаў тэхналогіі навучальнага працэсу на

дасягненне канчатковых мэт вучэбна-выхаваўчага працэсу, а менавіта — фарміраванне асобных якасцей і ўсёй асобы будучага спецыяліста ў іх непарыўным адзінстве.

3. Прынцып дэмакратызму і супрацоўніцтва выкладчыкаў і студэнтаў у працэсе сумеснай работы па выкананні дадзенага плана мерапрыемстваў.

Рэалізацыя плана падпарадкоўвалася паслядоўнаму вырашэнню наступных узаемазвязаных задач:

—вывучыць сучасную практыку размеркавання і выкарыстання выпускнікоў кафедры ў культурна-асветных установах краіны;

—пабудаваць мадэль прафесійнай дзейнасці спецыяліста, удакладніць пералік пасад і службовыя абавязкі спецыялістаў-выпускнікоў кафедры;

—вывучыць сучасную арганізацыю падрыхтоўкі спецыялістаў на кафедры;

—пабудаваць і апрабіраваць у навучальным працэсе эксперыментальную мадэль прафесійнай падрыхтоўкі спецыялістаў для работы ў сферы народна-інструментальнай творчасці;

—на аснове атрыманых вынікаў даследавання распрацаваць рэкамендацыі па далейшым удасканаленні тэхналогіі вучэбна-выхаваўчага працэсу на кафедры.

Усё гэта патрабуе вычлянення задач больш нізкага ўзроўню, якія і склалі план мерапрыемстваў кафедры. Ён увабраў у сябе стварэнне мадэлі прафесійнай дзейнасці спецыяліста-выпускніка кафедры на аснове ўліку: пасад, на якіх выкарыстоўваюцца выпускнікі; іх функцыянальных абавязкаў і характару работы; рэалізацыі спецыялістамі прафесійных задач і шляхоў іх рашэння; тыпаў дзейнасці спецыялістаў; прафесійных функцый спецыялістаў; якасцей, неабходных спецыялісту для паспяховага выканання прафесійных функцый (веды, уменні, навыкі, індывідуальна-псіхалагічныя параметры асобы, яе ўстаноўкі, каштоўнасныя арыентацыі, светапогляд).

Аналіз сучаснай арганізацыі падрыхтоўкі спецыяліста на кафедры ўключаў вывучэнне: зместу вучэбных планаў, праграм і іншай метадычнай і нарматыўнай дакументацыі; эфектыўнасці розных відаў дзейнасці студэнтаў (аўдыторныя заняткі, самастойная і навукова-даследчая работа студэнтаў, педагагічная і вытворчая практыка, бакалаўрская падрыхтоўка); выкарыстання ў навучальным працэсе сродкаў, формаў і метадаў; эфектыўнасці дыягностыкі канчатковага выніку педагагічнага



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

працэсу на кафедры (экзамены, залікі, конкурсы, канцэрты і інш.) узроўню педагагічнага майстэрства выкладчыкаў, выкарыстання імі сучасных педагагічных ідэй і методык.

На аснове вывучэння ўсталяванай на кафедры практыкі падрыхтоўкі спецыялістаў, асноўных тэндэнцый у рэфармаванні вышэйшай адукацыі ў краіне была пабудавана і апрабіравана эксперыментальная мадэль вучэбна-выхаваўчага працэсу, якая ўключала:

—прававое забеспячэнне эксперыментальнай мадэлі падрыхтоўкі спецыялістаў (удакладненне мэт і зместу вучэбных планаў і праграм у адпаведнасці з вынікамі даследавання дзейнасці спецыяліста);

—удасканаленне разнастайных відаў дзейнасці студэнтаў па наступных накірунках: аўдыторная вучэбная работа, самастойная работа студэнтаў, вытворчая і педагагічная практыка, навукова-даследчая і вучэбна-творчая дзейнасць студэнтаў і інш.;

—удасканаленне формаў і метадаў навучання (напрыклад, модульная будова курса і праграміраванае навучанне па інструментазнаўстве і інструментоўцы, абарона курсавых работ у форме работы з вучэбным аркестрам над уласнай партытурай);

—правядзенне залікаў і экзаменаў, рубежных праверак за самастойнай работай студэнтаў у форме канцэртаў і конкурсаў;

—прастора-часавыя фактары арганізацыі вучэбнага працэсу (расклад заняткаў, бюджэт часу, аўдыторны фонд),

—удасканаленне сродкаў навучання (выданне вучэбна-метадычнай літаратуры па дысцыплінах спецыялізацыі, набыццё музычных інструментаў, папаўненне фанатэкі, выкарыстанне тэхнічных сродкаў навучання, афармленне стэндаў, стварэнне кафедральнага кабінета тэхналогіі прафесійнай дзейнасці арганізатара народна-інструментальнай творчасці);

—павышэнне педагагічнага майстэрства выкладчыкаў кафедры;

—распрацоўка крытэрыяў ацэнкі і ўдасканаленне формаў дыягностыкі канчатковага выніку функцыяніравання кафедры.

У ходзе даследавання сучаснага стану і механізмаў функцыяніравання тэхналагічнай падсістэмы цэласнага вучэбна-выхаваўчага працэсу падрыхтоўкі спецыялістаў на кафедры народна-інструментальнай творчасці універсітэта былі зроблены высновы аб тым, што тэхналагічная база арганізацыі падрыхтоўкі кадраў у ВНУ адпрацавана пакуль яшчэ



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

недастаткова як на ўзроўні тэорыі, так і на ўзроўні рэальнай практыкі, а цэласнасць тэхналогіі і суаднясенне яе элементаў з сацыяльна-псіхалагічнай і культурна-асобаснай падсістэмамі забяспечваецца ў недастатковай ступені.

Мы ўстанавілі, што ў адносінах да ўсіх элементаў тэхналогіі мэты вучэбна-выхаваўчага працэсу выступаюць у якасці сістэмаўтваральнага элемента, які аб'ядноўвае ўсе астатнія ў цэласную сістэму. Мадэль спецыяліста выступае ў якасці мэты навучальнага працэсу і з'яўляецца падставай для ўдасканалення элементаў тэхналогіі і ўмацавання сувязей паміж імі. Адсутнасць на сённяшні дзень мадэлі спецыяліста, якая адпавядае ўсім патрабаванням, становіцца значнай перашкодай для арганізацыі эфектыўнай работы па ўдасканаленні навучальнага працэсу на кафедры.

Распрацоўка такой мадэлі ўяўляецца нам доўгачасовай і складанай праблемай, у вырашэнні якой неабходна аб'яднаць намаганні універсітэцкай і акадэмічнай навукі, практыкаў сферы народна-інструментальнай творчасці. У той жа час ужо сёння на кожным кроку неабходна ўзгадняць змяненні ў тэхналогіі з канкрэтнымі мэтамі, якія адлюстроўваюць сучасныя тэндэнцыі ў развіцці мастацкай творчасці. Таму зменам у змесце, формах, метадах навучання павінен папярэднічаць аналіз прафесійнай дзейнасці спецыяліста – выяўленне неабходных для рашэння прафесійных задач ведаў, уменняў, навыкаў, асобасных якасцей. І калі на ўзроўні факультэта гэтая работа можа ўвасобіцца ў пераліку вывучаемых прадметаў, у часе, які адводзіцца на іх вывучэнне, то на ўзроўні кафедры вучэбныя мэты павінны быць канкрэтызаваны, прадстаўлены пералікам відаў прафесійнай дзейнасці. У адпаведнасці з такімі мэтамі і здзяйсняецца адбор зместу, сродкаў, формаў, метадаў. Такім чынам, кафедра, і перш за ўсё выпускаючая, становіцца асноўным звяном удасканалення тэхналагічных асноў арганізацыі навучальнага працэсу ва універсітэце. Яе дзейнасць перш за ўсё неабходна накіроўваць на ўзгадненне вучэбнага працэсу ў ВНУ з сучаснай практыкай народна-інструментальнай творчасці, і падставай для гэтага можа стаць мадэліраванне ў навучальным працэсе універсітэта культуры сацыяльнага і прадметнага кантэксту будучай прафесійнай дзейнасці спецыяліста ў ходзе правядзення заняткаў з выкарыстаннем дзелавых гульняў, рашэння рэальных прафесійных праблем і стварэння для гэтага неабходных

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

матэрыяльна-тэхнічных і прастора-часавых умоў. Пры гэтым суаднясенне фарміруемых прафесійных рыс асобы студэнта з уяўленнямі аб асобе спецыяліста ўвогуле павінна стаць абавязковай умовай удасканалення ўсіх элементаў тэхналогіі вучэбнага працэсу, умацавання сувязей паміж імі, забеспячэння цэласнасці ўсяго працэсу падрыхтоўкі спецыялістаў. У гэтым, на наш погляд, і заключаецца сутнасць цэласнага падыходу да ўдасканалення тэхналагічных асноў арганізацыі вучэбна-выхаваўчага працэсу на кафедры народна-інструментальнай творчасці універсітэта культуры.

Абагульненне вынікаў эксперыментальнай работы адбывалася шляхам арганізацыі абмену вопытам у межах кафедры ў форме ўзаеманаведванняў, правядзення адкрытых урокаў, выступленняў з паведамленнямі і дакладамі на пасяджэннях прадметна-метадычных камісій і кафедры; арганізацыі выступленняў у перыядычным друку, на радыё і тэлебачанні аб ходзе эксперыментальнай работы на кафедры; шляхам удзелу ў навукова-практычных канферэнцыях; праз выданне кафедральнага зборніка навуковых артыкулаў па выніках эксперыментальнай работы і пастаноўку новых даследчых мэт.

Складанасць і шырыня пастаўленай у даследаванні праблемы не дазволіла нам у поўным аб'ёме адказаць на ўсе пытанні, звязаныя з удасканаленнем як асобных элементаў, так і ўсёй тэхналогіі навучальнага працэсу ўвогуле. Аднак атрыманыя вынікі пацвердзілі правільнасць меркавання аб правамернасці і дзейснасці выкарыстання цэласнага падыходу да вырашэння задач удасканалення вучэбна-выхаваўчага працэсу на ўзроўні выпускаючай кафедры універсітэта культуры. Безумоўна, гэты вынік патрабуе далейшага развіцця і ўдакладнення пры вырашэнні ўсёй разнастайнасці праблем навучальнага працэсу. Павышэнне ж эфектыўнасці яго выкарыстання мы звязваем перш за ўсё з далейшай работай па стварэнні і ўдакладненні мадэлі сучаснага спецыяліста і яго прафесійнай дзейнасці.

Адным з практычных вынікаў праведзенага даследавання стала ўдакладненая кваліфікацыйная характарыстыка спецыяліста – выпускніка кафедры, у якой даецца апісанне яго асноўных відаў дзейнасці, функцыянальных абавязкаў і патрабаванняў да спецыяльных ведаў, уменняў і навыкаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Кваліфікацыйная характарыстыка*
*спецыяліста вышэйшай кваліфікацыі па спецыяльнасці Г.12.03.00*
*"народная творчасць"*
*спецыялізацыя: Г.12.03.02 "інструментальная музыка (народная)"*
*кваліфікацыя: кіраўнік народнага аркестра (ансамбля), выкладчык музыкі*

Дадзеная кваліфікацыйная характарыстыка з'яўляецца дзяржаўным нарматыўным дакументам і ў адпаведнасці са спецыяльнасцю Г.12.03.00 "народная творчасць" і спецыялізацыяй Г.12.03.02 "інструментальная музыка (народная)" устанаўлівае прафесійнае прызначэнне і вызначае кваліфікацыйныя патрабаванні да спецыялістаў-выпускнікоў вышэйшых навучальных устаноў на дзённай і завочнай формах навучання.

*Прафесійнае прызначэнне спецыяліста*

Спецыяліст вышэйшай кваліфікацыі прызначаецца для работы ў культурна-асветніцкіх, навучальных, пазашкольных установах, арганізацыях розных сістэм і ведамстваў на пасадах, якія падлягаюць замяшчэнню спецыялістамі з вышэйшай музычнай адукацыяй.

Спецыяліст выконвае мастацка-творчую, выхаваўча-педагагічную, навукова-метадычную і арганізацыйна-кіраўнічую функцыі, забяспечвае сацыяльную інтэграцыю людзей, рэалізацыю іх інтарэсаў і патрэбнасцей, стварэнне культурных каштоўнасцей грамадства, развіццё музычнай культуры асобы.

Спецыяліст дзейнічае ў межах існуючых тэндэнцый у развіцці народна-інструментальнай музычнай культуры грамадства, такіх як пашырэнне віда-жанравай структуры і арганізацыйных формаў існавання народна-інструментальнага мастацтва; плюралізм творчых стыляў і метадаў; актыўнае развіццё дзіцячай мастацкай творчасці, традыцый прафесійнага, бытавога і фальклорнага мастацтва; рост папулярнасці малых (ансамблевых) жанравых формаў творчасці; устаноўка на самаарганізацыю, самавыражэнне і пошук творчага "я"; пэўная структурна-арганізацыйная аўтаномія ў адносінах да клубных устаноў; актыўнае выкарыстанне ўзораў нацыянальнай фальклорнай спадчыны.

Спецыяліст стварае ўмовы для творчай самарэалізацыі чалавека, арганізацыі зносін і вольнага часу розных сацыяльных груп



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

насельніцтва, для развіцця творчых здольнасцей, фарміравання асобасных якасцей. У сваёй рабоце спецыяліст абапіраецца на нефармальных лідэраў, аддае перавагу нефармальным, сяброўскім кантактам.

Аб'ектам дзейнасці спецыяліста з'яўляецца музычная народна-інструментальная творчасць насельніцтва на прафесійным і аматарскім узроўнях.

Галоўная мэта дзейнасці спецыяліста — стварэнне ўмоў для актывізацыі мастацка-творчай дзейнасці насельніцтва.

Асноўныя задачы спецыяліста з вышэйшай адукацыяй — кіраванне практыкай развіцця народна-інструментальнай культуры грамадства, навукова-метадычнае забеспячэнне яе развіцця, распрацоўка тэарэтычных праблем народна-інструментальнай творчасці, падрыхтоўка і павышэнне кваліфікацыі кіраўнікоў народна-інструментальных калектываў.

Спецыяліст выконвае наступныя асноўныя віды прафесійнай дзейнасці:

—арганізацыю і кіраванне народна-інструментальнымі калектывамі розных творчых накірункаў ва ўстановах, арганізацыях, па месцы жыхарства ў населеных пунктах, раёне, вобласці, рэспубліцы;

—арганізацыю і правядзенне навуковых даследаванняў у галіне народна-інструментальнага мастацтва, укараненне іх вынікаў у практыку, распрацоўку на аснове даных навуковага прагназіравання перспектыўных напрамкаў развіцця (сферы) народна-інструментальнай творчасці;

—арганізацыю прафесійнай падрыхтоўкі кіраўнікоў аматарскіх народна-інструментальных і фальклорных калектываў у сярэдніх спецыяльных навучальных установах, школах мастацтваў, на курсах павышэння кваліфікацыі;

—арганізацыю фестываляў, конкурсаў, аглядаў і канцэртаў з удзелам народна-інструментальных калектываў і выканаўцаў на народных інструментах.

Асобасныя якасці спецыяліста звязаны з педагагічнымі і творчымі здольнасцямі ў галіне народна-інструментальнага мастацтва. Сярод якасцей агульнага характару неабходны сацыяльная актыўнасць, паслядоўнасць і сістэматычнасць у дзеяннях, добрасумленнасць, таварыскасць, самавалоданне, такт, ураўнаважанасць, добразычлівасць і інш.

*Кваліфікацыйныя патрабаванні да спецыяліста*

*Спецыяліст павінен ведаць:*

—агульнагуманітарныя, сацыяльна-эканамічныя і агульнанавуковыя дысцыпліны ў аб'ёме праграмных патрабаванняў;

—дысцыпліны псіхолага-педагагічнага цыкла (педагогіка агульная, музычная, кіраванне аматарскім калектывам, пазашкольнага выхавання; псіхалогія агульная, узроставая, педагагічная, сацыяльная, мастацкай творчасці; методыкі выкладання спецыяльных дысцыплін);

—агульнапрафесійныя, музычна-тэарэтычныя, а таксама і спецыяльна-практычныя дысцыпліны, якія раскрываюць гісторыю і тэорыю сусветнай і нацыянальнай музычнай культуры ўвогуле, а таксама гісторыю і законы функцыяніравання народна-інструментальнай музычнай культуры Беларусі ў кантэксце сусветнай музычнай практыкі ў прыватнасці, сучасныя тэндэнцыі і перспектывы развіцця народна-інструментальнай культуры пісьмовай традыцыі;

—спецыфічныя, нацыянальна-характэрныя асаблівасці народна-інструментальнай музычнай культуры ў разнастайных формах яе існавання;

—прынцыпы і прыёмы збірання, сістэматызацыі, абагульнення і выкарыстання інфармацыі і правядзення навуковых даследаванняў у галіне музычнай культуры;

—музычны інструментарый беларускага народа як неад'емную частку духоўнай і матэрыяльнай нацыянальнай культуры Беларусі, асаблівасці яго гістарычнага фарміравання і практыку выкарыстання ў сучасных мастацкіх калектывах фальклорнага накірунку, гісторыю фарміравання беларускіх рэгіянальных выканальніцкіх школ ігры на народных інструментах, тэорыю выканальніцтва на народных інструментах;

—музыку вуснай і пісьмовай традыцый, вучэбны і канцэртны рэпертуары для народных інструментаў, аркестраў і ансамбляў розных складу і творчых напрамкаў, ролю нацыянальнага рэпертуару ў выхаванні нацыянальна-культурнай свядомасці ўдзельнікаў аматарскіх мастацкіх калектываў і слухачоў;

—сістэму і метады дзяржаўнага кіравання дзейнасцю аматарскіх калектываў у сучасных умовах, традыцыі і методыку арганізацыі і правядзення фестываляў, конкурсаў, святаў народнай музыкі;



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

—гісторыю і тэорыю інструментазнаўства (у тым ліку і этнаінструментазнаўства), прынцыпы і прыёмы інструментоўкі, аранжыроўкі, пералажэння і апрацоўкі для аркестраў і ансамбляў народных інструментаў;

—шляхі фарміравання прафесійнага майстэрства асобы кіраўніка аматарскага музычнага калектыву;

—псіхолага-педагагічныя ўмовы арганізацыі і кіравання дзіцячым народна-інструментальным калектывам;

—методыку падрыхтоўкі канцэртных праграм у аматарскім калектыве і арганізацыю яго канцэртнай дзейнасці;

—праблемы матэрыяльнага забеспячэння народна-інструментальных аматарскіх калектываў ва ўмовах грамадства з пераходнай эканомікай.

*Спецыяліст павінен умець:*

—прафесійна іграць на спецыяльным інструменце, а таксама на фартэпіяна, аркестравых і фальклорных інструментах — дудцы, жалейцы, гармоніку і інш., выконваць на спецінструменце разнастайны рэпертуар з твораў народнай, класічнай і сучаснай музыкі розных стыляў і жанраў; іграць у аркестрах і ансамблях народных інструментаў рознага складу;

—аналізаваць і рабіць расшыфроўкі ўзораў аўтэнтычнай народнай інструментальнай музыкі;

—ствараць уласныя інструментоўкі і аранжыроўкі, апрацоўкі і пералажэнні для аркестраў, ансамбляў і асобных народных інструментаў;

—праводзіць тэарэтычныя і практычныя даследаванні ў галіне музычнай культуры, у сферы народна-інструментальнай творчасці;

—выкладаць спецыяльны інструмент, вывучаць педагагічны і выканальніцкі вопыт, творча карыстацца ім у сваёй музычна-педагагічнай дзейнасці;

—акампаніраваць спевакам, інструменталістам, танцорам у якасці акампаніятара на баяне (акардэоне), кіраўніка ці ўдзельніка аркестра і ансамбля народных інструментаў;

—прафесійна кіраваць ансамблем і аркестрам народных інструментаў, выкладаць дырыжыраванне (для кіраўнікоў аркестраў);

--чытаць і аналізаваць музычныя творы для народных інструментаў, а таксама партытуры для народна-інструментальных калектываў, сімфанічнага аркестра;

--чытаць з ліста музычную літаратуру на спецыяльным інструменце, ансамблевыя і аркестравыя партыі, імправізаваць і падбіраць на слых ;

—ствараць народна-інструментальныя калектывы розных творчых накірункаў з розных сацыяльных і ўзроставых груп насельніцтва з улікам канкрэтных умоў рэгіёнаў; ажыццяўляць кіраванне аматарскімі і творчымі калектывамі, забяспечваць мастацкую, арганізацыйную і тэхнічную часткі іх дзейнасці; весці вучэбна-выхаваўчую, рэпетыцыйную, мастацка-адукацыйную, канцэртна-выканальніцкую работу сярод удзельнікаў аматарскіх калектываў, садзейнічаць росту іх выканальніцкага майстэрства і павышэнню агульнакультурнага ўзроўню; фарміраваць рэпертуар аматарскіх калектываў, рыхтаваць іх творчыя выступленні і справаздачы перад насельніцтвам; матэрыяльна забяспечваць іх дзейнасць ва ўмовах грамадства з пераходнай эканомікай.

*Спецыяліст павінен:*

—мець шырокі кругагляд, высокія маральныя якасці, актыўную жыццёвую пазіцыю, валодаць навыкамі арганізацыйнай работы ў калектыве, працаваць над павышэннем свайго культурнага і прафесійнага ўзроўню;

—быць адказным за даручаную справу, праяўляць ініцыятыву і творчасць у працы;

—ведаць гісторыю культуры сваёй дзяржавы і актыўна яе прапагандаваць; валодаць дзяржаўнымі мовамі, спрыяць забеспячэнню сапраўднага іх раўнапраўя ва ўсіх сферах жыццядзейнасці;

—ведаць заканадаўчыя акты Рэспублікі Беларусь у галіне культуры, мастацтва і адукацыі, асновы дзяржаўнага права і экалогіі;

—садзейнічаць захаванню і развіццю асноўных напрамкаў сацыяльна-камунікатыўнай дзейнасці чалавека ў галіне культуры і мастацтва і яго імкненню да пазнання, развіццю творчых здольнасцей, задавальненню эстэтычных патрэбнасцей; набыццю прафесійных уменняў і навыкаў, патрэбнасцю творча праводзіць вольны час.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ